Падтрымай "Вясну" на PATREON

За адмову размаўляць з КДБ – штраф 20 базавых велічынь

27.03.2018 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



26 сакавіка ў судзе Баранавічскага раёна і г. Баранавічы адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы ў дачыненні да актывіста **Іллі Сянько**. Яго вінавацілі ў непадпарадкаванні законнаму патрабаванню службовай асобе (арт. 23.4 КаАП) за тое, што ён не з'явіўся на прафілактычную размову ў КДБ.

Пры гэтым позву на размову хлопец асабіста не атрымліваў, яе падпісала яго маці, хоць яны жывуць паасобку.

Варта адзначыць, што першае паседжанне адбылося 23 сакавіка, але ў працэсе быў аб'яўлены перапынак па хадайніцтву Іллі Сянько на ўдзел абаронцы.

26 сакавіка суддзя **Аксана Копаць** працягнула разгляд, па выніку якога прызнала актывіста вінаватым у адміністрацыйным правапарушэнні і прыняла рашэнне пакараць Іллю Сянько штрафам у 20 базавых велічынь.

Праваабаронца "Вясны" **Сяргей Гоўша**, які маніторыў судовы працэс, адзначыў:

> *"Мы будзем абскаржваць гэтую абсурдную пастанову!"*

Нагадаем, 22 сакавіка ўчастковы ўручыў позву ў суд Іллі Сянько са словамі, што гэта з-за таго, што ён не з'явіўся ў КДБ на "прафілактычную размову". Больш за месяц таму валанцёрамі культурна-асветніцкай установы "Крытычнае мысленне" сталі цікавіцца супрацоўнікі КДБ. На размову па тэлефоне спрабавалі выклікаць Іллю Сянько, які быў затрыманы з расійскім філосафам і гісторыкам **Пятром Рабавым** і асуджаны па арт. 17.10 КаАП ("публічнае дэманстраванне нацысцкай сімволікі") да штрафу з канфіскацыяй жорскага дыску камп'ютара. Аднак хлопец прапанаваў

супрацоўніку даслаць яму позву і адмовіўся без яе прыходзіць. Тады на размову выклікалі яго маці, якой супрацоўнік Баранавіцкага міжраённага аддзела КДБ па Брэсцкай вобласці **Мікалай Безік** расказваў “байкі” пра ўстанову, а таксама прымусіў падпісаць позву за сына.

Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY